ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

# ЕДЗЕМ НА КЛІМАВІЦКІЯ МАЛЬДЫВЫ!

## У райцэнтры распрацоўваюць унікальны прыродны маршрут, які, як тут спадзяюцца, прывабіць шматлікіх гасцей

**Мелавыя кар'еры ў Клімавічах — і сёння адно з самых найлепшых месцаў адпачынку. Вада ў іх незвычайнага блакітна-смарагдавага колеру. Ды і рэльеф цудоўны. Лес, азёры, выспы — глядзіш і дух захоплівае. У інтэрнэце клімавіцкія кар'еры пазіцыянуюцца як адзін з пяці найпрыгажэйшых прыродных аб'ектаў Беларусі. На жаль, месца пакуль не «раскручанае». Але, як расказалі карэспандэнту «МС» у Клімавіцкім райвыканкаме, усё яшчэ наперадзе.**

Знаходзяцца гэтыя прыгожыя мясціны за некалькі кіламетраў ад горада: выязджаеш і пайшла чарада кар'ераў — чатыры вялікія азёры і шмат маленькіх. Пры жаданні пабываць там можна без праблем. Для гэтага ёсць прыватны грамадскі транспарт.

— Раней у кар'ерах здабывалі для сваіх патрэб пясок і мел вапнавы і цагельны заводы, а калі прадпрыемствы закрыліся, гэтыя месцы адкарэктавала прырода. Грунтовыя воды падняліся, і ўтварылася ўся гэтая прыгажосць. Там ёсць і пясчаныя кар'еры, і мелавыя, — кажа **загадчык сектара спорту і турызму Клімавіцкага райвыканкама Равіль САБІРАЎ.**

— Гэта нашы клімавіцкія Мальдывы, можаце мне паверыць, — запэўнівае **галоўны спецыяліст сектара Аляксандр ЧАБАН.** — Я быў на сапраўдных Мальдывах і кажу з поўнай адказнасцю: нашы нічым не горшыя — такія ж белыя горы, блакітная вада. Спалучэнне наогул незвычайнае. Засталося знайсці спонсара, які надасць гэтаму дыяменту годную аграноку. Месца проста шыкоўнае.

Пакуль ідэя толькі прапрацоўваецца, шукаюцца крыніцы фінансавання. Перш за ўсё спатрэбіцца зрабіць там зону адпачынку, правяраць дно кар'ераў. Дарэчы, глыбіня іх да 15 метраў. Купацца там забаронена. Самастойна райвыканкаму такія маштабы не пацягнуць, таму інфармацыя ўкладваецца ў вушы прадпрымальных людзей. Пакуль безвынікова.

— Калі знойдуцца ахвотныя прыехаць паглядзець на гэтую прыгажосць летам, наш Цэнтр здароўя можа даць палатку, спальны мяшок, іншую амуніцыю, — кажа загадчык сектара. — Гэта самае малое, што мы пакуль можам прапанаваць. Хацелася б, каб месца стала больш даступнае не толькі для жыхароў Клімаўшчыны, але і для ўсіх. Нават на карцінках яно выглядае чароўна. А ўяўляеце, як прыгожа на месцы? Можна было б наогул зрабіць цікавы водны маршрут — аб'яднаць клімавіцкія кар'еры з крычаўскімі, да якіх недзе 30 кіламетраў.

Сёння можна камфортна адпачыць у Доме паляўнічага каля вёскі Бліунг. Ад Клімавіч гэта кіламетраў сем. Там ёсць сцежка здароўя, сажалка, альтанкі, масток, які вядзе ўглыб возера.

Дарэчы, месца гэтае з цікавай гісторыяй. Калісьці тут быў Свірэльскі маёнтак і фальварак багатага яўрэя Блеўна. У часы Кацярыны Вялікай гаспадар быў сасланы, а маёнтак перайшоў пану Шацкаму. Пасля рэвалюцыі тут была створана камуна, але назва Бліунг захавалася. Маёнтка больш няма, але мясціны выдатныя.



Равіль САБІРАЎ дэманструе клімавіцкія Мальдывы.

— Тут вельмі любяць адпачываць расіяне, — кажа Равіль Сабіраў. — Хутка зноў да нас прыедуць, будуць тут паляваць. Наогул паляўнічы турызм развіты ў нас вельмі добра. Гэта і грошы для раёна, і імідж для краіны.

Клімавічы ведаюць таксама і як сталіцу міжнароднага дзіцячага фестывалю «Залатая пчолка». На свята, якое праводзіцца ў Міжнародны дзень абароны дзяцей, з'язджаецца шмат народу, у тым ліку з блізкіх раёнаў Расіі — Шумяцкага і Рослаўльскага. Дарэчы, Клімавічы — адзін з нямногіх райцэнтраў, якія могуць пахваліцца сапраўды камфортнай гасцініцай у цэнтры горада.

Але мала хто ведае, што Клімавічы калісьці былі яшчэ і лыжнай сталіцай. І сектар спорту і турызму марыць адрадзіць гэтыя традыцыі. Тым больш што гэта ў міжнародных інтарэсах.

— Мы вельмі добра супрацоўнічаем з Расійскай Федэрацыяй, — расказвае Аляксандр Чабан. — Запрашаем іх да сябе ў госці, самі ездзім. З нашымі лыжнікамі займаецца заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Віктар Шапораў. Нам не хапае спартыўнага комплексу. Мы марым пра лыжаролерную трасу, хоць невялікую — як зрабілі ў расійскім гарадку Прудок Рослаўльскага раёна. У нас адораных дзяцей хапае — у Клімавічах ганарацца сваімі спартыўнымі зоркамі. У іх ліку сярэбраны прызёр чэмпіянату свету Юрый Астапенка, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў па біятлоне Вячаслаў Талкачоў. Але вельмі складана трэніраваць будучых зорак, калі няма ўмоў. Дзіцячая спартыўная школа мае толькі адзін стадыён — там табе і валейбольнае поле, і баскетбольнае, і турнікі. А быў бы спартыўны комплекс, можна было б расіян запрашаць, валюту зарабляць. Трэнерскія кадры ў нас моцныя, і вынікі ёсць. Можна было б і іншыя віды спорту культываваць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

# БЕЛАЗ, КІНАТУРЫЗМ

## Пагоня за ўражаннямі

Кажучы пра ўязны турызм у Беларусі, усе прывыклі лічыць традыцыйнымі яго відамі культурна-пазнавальны, аздараўленчы і аграгурызм, аднак апошнія пару гадоў у краіне пачалі актыўна развівацца і новыя віды. Сярод іх, напрыклад, прамысловы турызм, які здабыў вялікую папулярнасць як сярод замежнікаў, так і сярод беларусаў.



— Каля 120 прадпрыемстваў сёння праводзяць экскурсіі па сваіх тэрыторыях. Гэта не звыклыя экскурсіі з мэтай прафарыентацыі для студэнтаў: яны створаны менавіта для турыстаў, — расказвае Віталь Валер'евіч. — Флагманам у гэтым кірунку з'яўляецца БелАЗ. Для многіх цікава сфатаграфавацца на фоне 450-тонніка або пакатацца на ім. Асобна можна сказаць і пра Мінскі трактарны завод: у рамках наведвання гэтага прадпрыемства турыст можа не толькі паглядзець экспазіцыю, папрацаваць на трактары, але яшчэ і паўдзельнічаць у яго зборцы. Пасля чаго ён атрымлівае сертыфікат, які пацвярджае, што трактар з пэўным нумарам, які праз два месяцы адправіцца, скажам, у Эфіопію, сабраны яго рукамі. Людзі сёння імкнуцца па ўражанні, ім гэта падабаецца, таму такія экскурсіі карыстаюцца попытам.

У прамысловым турызме таксама традыцыйнай папулярнасцю карыстаецца наша харчовая прамысловасць — такія прадпрыемствы, як «Камунарка» або «Слодыч».

— Вельмі цікавыя экскурсіі прапануе завод «Аліварыя»: яны абсталявалі прадпрыемства аўдыягідамі, тураператары па просьбе гасцей уключаюць гэтыя экскурсіі на завод у пакет аглядных па Мінску.

Віталь Валер'евіч таксама адзначае, што нядаўна ў Беларусі адкрылі кінатурызм. Беларуская нацыянальная студыя «Беларусьфільм» праводзіць у сябе экскурсіі, дзе можна паглядзець розныя дэкарацыі і прымераць касцюмы любімых герояў «з тэлевізара».

## Першыя ў сусветным рэйтынгу

Новы імпульс атрымаў і экалагічны турызм: нягледзячы на тое што ўжо даўно стаў традыцыйным, ён працягвае развівацца ў новых варыянтах з пункту гледжання аказання паслуг.

— Напрыклад, у некаторых нацыянальных парках вельмі папулярнай стала хада па балотах. Турысты прыязджаюць у Беларусь, каб паслухаць спевы птушак, сфатаграфаваць зубра ці таго ж ваўка на фотапасткі. Гэта не так запатрабавана ў расіян, як у еўрапейцаў, — расказвае Віталь Грыцэвіч. — Наогул для аматараў экалагічнага турызму адпачынак у Беларусі — унікальная магчымасць атрымаць асалоду ад прыроды ў экалагічна чыстых, не кранутых урбанізацыяй кутках. Многія прыродныя аб'екты краіны лічацца эксклюзіўнымі ў Еўропе. У першую чаргу гэта нацыянальныя паркі «Нарачанскі», «Прыпяцкі», «Браслаўскія азёры», «Белавежская пушча», Бярэзінскі біясферны запаведнік, заказнікі «Налібоцкая пушча», «Блакітныя азёры» і многія іншыя. Незвычайным месцам з'яўляецца і Бярэзінскі запаведнік — адзінае месца ў Еўропе, дзе на адной кампактнай тэрыторыі ў дзікіх умовах жыве «Вялікая еўрапейская пяцёрка» млекакормячых: лось, зубр, мядзведзь, воўк і рысь. Вялікую папулярнасць набірае і чарнобыльская зона.

Адна з ужо вядомых «фішак» Беларусі — аграгурызм. Рускамоўная версія часопіса National Geographic ужо некалькі гадоў запар прызнае нашу краіну найлепшай у адпаведнай намінацыі. Беларусь абагнала ў гэтым відзе турызму Італію і Францыю.

— Нават калі не браць рэйтынгі, пра нашы дасягненні ў гэтай сферы сведчыць той факт, што генеральны сакратар Сусветнай турысцкай арганізацыі (ЮНВТО) Зураб Палалікашвілі, прыехаўшы ў Беларусь у чэрвені, заявіў, што ЮНВТО плануе 2020 год абвясціць годам агра- і экатурызму, а канферэнцыя, прысвечаная гэтай падзеі, пройдзе менавіта ў Мінску — у маі наступнага года. Гэта паказчык таго, што на сусветным узроўні Беларусь прызнана ў сферы аграгурызму, — кажа суразмоўнік і дадае, што ў гэтым кірунку, нягледзячы на паспяховае развіццё, існуюць і праблемныя моманты. — Аграгурызм развіваецца дзякуючы ўказу Прэзідэнта, які дзейнічае яшчэ з 2008 года. Два гады таму ў дакумент былі ўнесены змены, якія адрэгулявалі дзейнасць суб'ектаў аграгурызму, дзяржава дала для іх дадатковыя магчымасці, але нам яшчэ ёсць над чым працаваць.

Віталь Валер'евіч адзначае, што аграгурызм у Беларусі мае разнастайныя спецыялізацыі. Адны аграсядзібы канцэнтруюцца на гастраноміі — гаспадары збіраюць рэцэпты, гатуюць стравы, якімі частуюць гасцей. Другія паказваюць народныя абрады, традыцыі і праводзяць цэлыя фэсты, трэція спецыялізуюцца на актыўным адпачынку, арганізуюць сплавы і даюць месцы для палатак.

Працягвае развівацца ў краіне і гастранамічны турызм, хоць і не такімі актыўнымі тэмпамі. Віталь Грыцэвіч адзначае, што, нягледзячы на некаторыя дасягненні, ад сусветнага ўзроўню Беларусь пакуль значна адстае.

— Сёлета тры беларускія прадстаўнікі занялі прызавыя месцы ў конкурсе сярод барменаў. Апошнім часам рэстаранная культура павышаецца. Безумоўна, трэба запрашаць у Беларусь больш ку-

У краіне функцыянуе больш за 150 музейных устаноў, самымі наведвальнымі з якіх з'яўляюцца музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Брэсцкая крэпасць-герой», музей-запаведнік «Нясвіж», Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, музей «Замкавы комплекс «Мір».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# У МІНУЛАЕ

**Віцебская вобласць мяжуе як з ЕС, так і з Расіяй. З улікам гэтага можна вельмі добра зарабляць на турызме. Менавіта такі бізнес стаў для заходніх суседзяў «фішкай» для развіцця вёсак і гарадкоў, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. У Віцебшчыны таксама нямала прыемных нюансаў, якія робяць яе вельмі прыцягальнай для наведвання.**

Напрыклад, менавіта тут знаходзіцца самы старажытны горад нашай краіны — Полацк. І, дарэчы, тутэйшыя — у авангардзе рэалізацыі турыстычных праектаў. У адным з сельсаветаў паспяхова арганізоўваюць катанне на паветраным шары. Аматары «гуляць у мінулае» з клуба рэканструкцыі могуць не толькі паказаць на фэстах, як ваявалі, танцавалі, дзе жылі продкі, але і пакатаць на судне — дакладнай копіі тых, на якіх плавалі калісьці па Заходняй Дзвіне...

Кіраўніцтва мясцовай улады раённага і абласнога ўзроўню, калі вядуцца перагаворы з прадстаўнікамі пасольстваў, інвестарамі, заклікаюць укладваць грошы ў турызм. І ўжо нямала прыкладаў, калі з выніку дзясяткі і сотні тысяч рублёў выдаткоўваюць на аднаўленне, рэканструкцыю сядзіб, у будаўніцтва атэляў і комплексаў для аздараўлення і адпачынку.

Адзін з найбольш перспектыўных кірункаў — пункты для зарадкі электрычных аўто і сэрвіс для аўтатурызму. Гаворка ідзе пра аўтамабільнае падарожжа з пражываннем у кемперах або аўтапрычэпах. Напэўна, кожны, хто быў у краінах Еўропы, бачыў вялікае мноства іх. Перад выхаднымі яны чарадой пакідаюць горад. Кемпер нагадвае маленькі вагончык. Ён, як сапраўдны цягнік, запраўляецца на спецыяльнай станцыі — кемпінгу. Аўтадом трэба «перазарадзіць», таму яму патрабуюцца электрычная разетка, каналізацыйны зліў для біяпрыбіральні, падводка вады са шлангам, магчымасць заліву вады ў бойлер. Нарэшце, зразумела, падарожнікі хочуць прыняць ванну і душ пасля некалькіх дзён у дарозе. І такіх стаянак у Прыдзвінскім краі становіцца ўсё больш.

Адпаведная інфармацыя выкладваецца на тэматычны сайт. Медыцынскі турызм таксама з кожным годам становіцца ўсё больш запатрабаваны і папулярны сярод замежных грамадзян. Гэтаму спрыяюць высокая якасць паслуг, якія аказваюцца, і выдатная аснашчанасць медцэнтраў, бальніц і клінік. Вельмі прыцягвае патэнцыйных кліентаў высокая кваліфікацыя медыкаў, якія рэгулярна стажыруюцца ў вядучых клініках свету. Беларускія спецыялісты выкарыстоўваюць прагрэсіўныя методыкі лячэння пры адначасова невысокім кошце медыцынскіх паслуг.

Добры бонус — зручнае геаграфічнае становішча вобласці, і ў цэлым краіны. Ды і клімат